# СЕКЦИЯ 2

## *История и культура европейского пограничья в контексте Центральной и Восточной Европы*

*Коваль В.У.*

# СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСКАЙ І ЎКРАІНСКАЙ ДЫЯСПАР У АДУКАЦЫЙНАЙ І НАВУКОВАЙ СФЕРАХ (1918-1939 ГГ.)

Чэхаславакія ў міжваенны перыяд стала буйнейшым замежным цэнтрам беларускага студэнцкага жыцця. Асноўная частка беларускай моладзі ў ЧСР паходзіла з тэрыторыі Заходняй Беларусі. Па прычыне дыскрымінацыйнай польскай палітыкі ў галіне адукацыі беларусы былі вымушаны шукаць альтэрнатыўныя магчымасці свайго прафесійнага развіцця ў замежных вышэйшых навучальных установах. Адметнасцю Чэхаславакіі для эмігрантаў стала правядзенне афіцыйнай дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на падтрымку жыхароў былой Расійскай імперыі. Комплекс мерапрыемстваў з 1921 г. для эмігрантаў атрымаў назву "Руская акцыя дапамогі". Праграма была накіравана ў першую чаргу на развіццё адукацыйнага, культурнага і навуковага патэнцыялу эмігрантаў. Міністэрства замежных спраў ЧСР адказвала за рэалізацыю акцыі, кантралявала колькасць эмігрантаў, праводзіла іх улік, адсочвала вылучэнне фінансавых сродкаў, рэгістравала аб'яднанні, саюзы і партыі эмігрантаў. Значная ўвага ў рамках дзяржаўнай палітыкі адводзілася студэнцкім праектам, развіццю адукацыйных устаноў дыяспар і стымуляванню грамадскай актыўнасці моладзі на міжнародным узроўні.

Асобнай тэмай даследавання спадчыны беларускай дыяспары з'яўляецца яе супрацоўніцтва з украінскай супольнасцю замежжа. Супольным студэнцкім праектам у Чэхаславакіі спрыяў той факт, што беларускія і ўкраінскія эмігранты разам набывалі адукацыю ў чэшскіх навучальных установах у Празе, Брно, Падэбрадах, Браціславе. Большасць беларускіх і ўкраінскіх студэнтаў вучылася ў Карлавым універсітэце і Чэшскім вышэйшым тэхнічным вучылішчы (Пражская палітэхніка). Беларускіх вышэйшых навучальных устаноў у Чэхаславакіі не было, таму асобныя беларускія студэнты набывалі адукацыю ва Украінскім вольным універсітэце, Украінскім вышэйшым педагагічным інстытуце імя М. Драгаманава, Украінскай гаспадарчай акадэміі (яе паслядоўнік – Украінскі тэхніка-гаспадарчы інстытут).

Шырокія кантакты з украінскай дыяспарай мела Беларуская Рада ў Празе, створаная ў 1923 г. З моманту свайго заснавання арганізацыя

акрэсліла свой статус у асяродку беларускай дыяспары, бо актывістамі Рады і яе ганаровымі членамі сталі вядомыя грамадскія дзеячы замежжа. У склад Прэзідыума ўвайшлі П. Крэчэўскі (старшыня), В. Захарка, У. Пракулевіч, М. Вяршынін, а членамі Рэвізійнай камісіі былі абраныя Л. Заяц (старшыня), А. Цвікевіч, Я. Сак [1]. Шэраг беларускіх эмігрантаў з Літвы, Латвіі, ЗША, Балгарыі далучыліся да дзейнасці Беларускай Рады ў Празе ў якасці ганаровых членаў.

У 1923 г. Прэзідыум рады абмяркоўваў пытанне аб дэлегаванні свайго прадстаўніка ў Чэшска-ўкраінскі камітэт дапамогі ўкраінскім і беларускім студэнтам у Празе. Асноўнай мэтай арганізацыі стала маральная і матэрыльная дапамога беларускай і ўкраінскай студэнцкай моладзі ў Чэхаславакіі. Камітэт прызначаў стыпендыі найбольш здольным і таленавітым асобам, адсочваючы іх адзнакі і навуковыя дасягенні. У пратаколе пасяджэння Прэзідыума пазначалася: "Прымаючы пад увагу, што згодна са статутам Чэска-Украінскага Камітэта беларускае грамадзянства маець права на 1 свайго прэдстаўніка у Камітэце, пастанавілі: дэлегаваць у Чэска-Украінскі Камітэт сябра Прэзыдыума Беларускае Рады ў Чэхаславакіі Уладзімера Пракулевіча [2]". Супрацоўніцтва беларускіх грамадскіх арганізацый з камітэтам пашырала магчымасці арганізацыі. Рада ў Празе дапамагала ў пошуках таленавітай моладзі ў асяродку дыяспары, каб аказаць ёй матэрыяльную і маральную падтрымку ў студэнцкія гады. Камітэт актыўна працаваў да 1931 г., аднак па прычыне згортвання "Рускай акцыі дапамогі" арганізацыя была рэарганізавана ў фонд і згарнула асноўныя праграмы. Беларуская Рада ў Празе мела шырокія кантакты з украінскай супольнасцю. Украінскі грамадскі камітэт супрацоўнічаў з Радай, дапамагаў матэрыяльна значнымі сумамі ў чэшскіх кронах для выплат беларускім студэнтам, якія не атрамалі стыпендый, прадстаўляў яе членам месцы ў інтэрнаце, ладзіў танныя абеды ва Украінскай хаце для беларускай студэнцкай моладзі.

Украінскае студэнцтва і прафесура прымалі актыўны ўдзел у міжнародных форумах, канферэнцыях і з'ездах. Асноўнай задачай, якую прадстаўнікі дыяспары ставілі перад сваімі выступоўцамі, было інфармаванне замежнага грамадства пра ўкраінскую нацыю і нацыянальныя праблемы. Украінская супольнасць на міжнародным узроўні адстойвала свае прафесійныя інтарэсы, развівала кантакты са студэнцкімі арганізацыямі іншых краін, падтрымліва беларускіх эмігрантаў.

Асаблівым уплывам на ўкраінскую студэнцкую моладзь у 1920-я гг. вызначаўся Цэнтральны саюз украінскага студэнцтва (ЦЕСУС), які аб'яднаў арганізацыі студэнтаў Чэхаславакіі, Венгрыі, Балгарыі, Германіі, Аўстрыі, ЗША, Італіі і інш. У склад арганізацыі ўваходзілі як студэнцкія аб'яднанні замежжа, так і арганізацыі Заходняй Украіны.

ЦЕСУС быў прадстаўлены студэнцкай моладдзю розных палітычных поглядаў і перакананняў, арганізацыя фактычна яднала ўсе ідэалагічныя плыні ўкраінскага замежжа. Саюз аказваў дапамогу эмігрантам у юрыдычных пытаннях, каардынаваў дзейнасць асобных студэнцкіх арганізацый, займаўся выдавецкай справай. Адметнасцю ЦЕСУС стала яго паспяховая міжнародная дзейнасць. На I Сусветным кангрэсе вольных украінцаў дакладна было акрэслена, што ў міжваенны перыяд ЦЕСУС, які ў канцы 1920-х гг. аб'яднноўваў 32 украінскія студэнцкія арганізацыі, адыграў ролю неафіцыйнага пасла Украіны за мяжой, выконваючы абавязкі агульнага каардынацыйнага і рэпрэзентацыйнага цэнтра [3, с. 73]. Як толькі ЦЕСУС стаў вольным членам Міжнароднай студэнцкай канфедэрацыі, саюз пачаў падтрымліваць беларускае студэнцтва і прадстаўляць беларускія інтарэсы на міжнароднай арэне.

Украінская студэнцкая моладзь з 1921 г. распачала сваю грамадскую працу ў Міжнароднай студэнцкай канфедэрацыі (CIE – Confédération Internationale des étudiants). Цэнтральны орган канфедэрацыі знаходзіўся ў Брусэлі. Першапачаткова арганізацыя была створана прадстаўнікамі бельгійскага, французскага і чэшскага студэнцтва. Нягледзячы на тое, што ўкраінскае студэнцтва было прынята ў CIE ў якасці вольнага члена, яно адрознівалася сваёй актыўнай грамадскай пазіцыяй па асноўных пытаннях міжнароднага студэнцкага руху.

Пры дапамозе Цэнтральнага саюза ўкраінскага студэнцтва ў 1926 г. у CIE было прынята Аб'яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый у якасці вольнага члена. Беларукія студэнты адразу ўключыліся ў дзейнасць CIE, пачалі прымаць удзел у кангрэсах арганізацыі, ажыццяўлялі ліставанне з цэнтральным органам у Брусэлі, спрабавалі арганізаваць абмен студэнтамі і замежныя экскурсіі. Прыкладам актыўнай грамадскай пазіцыі з'яўляецца ўдзел беларускай дэлегацыі ў IX Кангрэсе Міжнароднай студэнцкай канфедэрацыі, які праходзіў у Рыме з 23 жніўня па 4 верасня 1927 г. Беларускае студэнцтва ў Рыме прадстаўлялі А. Клімовіч і К. Кулак. Дэлегаты кангрэса ўзнялі пытанне дыскрымінацыі беларусаў у Другой Рэчы Паспалітай, праблему рэпатрыяцыі беларускага студэнцтва, пытанне настрыфікацыі замежных дыпломаў у Польшчы. Беларускамоўная газета "Сялянская ніва" ў артыкуле пра кангрэс падкрэслівала: "Апрача Беларусаў з такімі-ж дамаганьнямі выступілі Украінцы, якія мелі фактычны матэрыял сабраным" [4, с. 3]. Украінскія студэнты актыўна падключыліся да абароны беларускіх інтарэсаў на міжнародным узроўні, бо дэлегацыю студэнтаў-беларусаў не ўключылі ў камісію па аналізу пералічаных пытанняў. Асноўнымі апанентамі ў спрэчках сталі польскія дэлегаты.

Беларускія і ўкраінскія студэнцкія арганізацыі актыўна працавалі ў Міжнароднай студэнцкай канфедэрацыі да 1938 г., аднак па прычыне пратэстаў польскіх студэнтаў яны былі выключаны з CIE. Польскія

прадстаўнікі абапіраліся на юрыдычны бок, бо тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны былі часткай Другой Рэчы Паспалітай, студэнты мелі польскія дакументы, а прадстаўлялі свае нацыянальныя арганізацыі. Выключэнне беларускай і ўкраінскай дэлегацыі з СІЕ выклілала шчырае публічнае абурэнне на старонках перыядчыных выданняў эмігрантаў.

Беларуска-ўкраінскае супрацоўніцтва развівалася таксама ў навуковай сферы. Пры Украінскім сацыялагічным інстытуце ў Празе быў створаны Беларускі навуковы кабінет (БНК), які з 1927 па 1930 гг. узначальваў вядомы беларускі грамадскі дзеяч Тамаш Тамашавіч Грыб. Украінскі сацыялагічны інстытут з'яўляўся навуковай установай, таму дзейнасць Беларускага навуковага кабінета адпавядала профілю арганізацыі. Бібліятэка БНК збірала кнігі і перыядычныя выданні БССР, Заходняй Беларусі, прэсу беларускіх эмігрантаў, украінскія, рускія і чэшскія выданні. Напрыклад, у калекцыі захоўваліся нумары газеты "Украінская грамада" за 1925 г. і ўкраінскай газеты "Наша жыццё" за 1925 г., што сведчыць пра важнасць бягучых ацэнак украінскай прэсы для беларускіх эмігрантаў.

Манаграфія ўкраінскага эмігранта Сымона Нарыжнага "Украінская эміграцыя. Культурная праца ўкраінскай эміграцыі паміж дзвюх сусветных войнаў" з'яўляецца адной з асноўных гістарычных крыніц у вывучэнні дыяспары. Даследаванне змяшчае багатую фактуру пра дзейнасць украінскай эміграцыі. Ствараючы поўную краціну дзейнасці ўкраінцаў замежжа, аўтар узгадвае некаторыя супольныя беларуска-ўкраінскія арганізацыі, пра якія складана знайсці звесткі ў іншых групах гістарычных крыніц.

Студэнцкая моладзь у Чэхаславакіі імкнулася да аб'яднання па сваёй асноўнай спецыялізацыі. Сярод разнастайных прафесійных арганізацый у манаграфіі ўзгадваецца Грамада ўкраінскіх і беларускіх студэнтаў лясной інжынерыі ў Празе. С. Нарыжны таксама вылучае дзейнасць Цэнтральнага бюро працы ўкраінскай і беларускай акадэмічнай эміграцыі ў Чэхіі, створанага ў 1927 г. [5, с. 85]. Мэтай бюро стала дапамога ў працаўладкаванні моладзі пасля атрымання вышэйшай адукацыі ў Чэхаславакіі. Нягледзячы на тое, што арганізацыя праіснавала нядоўга, да яе дзейнасці далучылася 19 розных студэнцкіх суполак. Пытанне працаўладкавання для выпускнікоў стаяла вельмі востра. Частка моладзі, атрымаўшы дыплом, вярталася на радзіму. Некаторыя маладыя людзі (асабліва з тэхнічнымі спецыяльнасцямі) заставаліся працаваць у Чэхаславакіі, ехалі ў ЗША ці Канаду. Праблему працаўладкавання у пэўнай ступені дапамагала вырашаць Ліга Нацый.

Лёс украінскага эмігранта Сымона Нарыжнага, які пакінуў у сваім даследаванні каштоўныя звесткі пра дзейнасць супольнасці замежжа, дастаткова трагічны. Даследчык імкнуўся да сістэматызацыі інфармацыі, да захавання памяці пра ўкраінскую эміграцыю ў выглядзе музейнай калекцыі і сваіх навуковых публікацый, аднак яго назвалі савецкім агентам пасля заканчэння Другой сусветнай вайны і распачалі кампанію

перасследавання. Багатыя матэрыялы Сымона Нарыжнага ў 1945 г. патрапілі савецкім спецыяльным службам, якія выкарысталі іх у барацьбе з эміграцыяй. Пасля публічных абвінавачванняў С. Нарыжны быў вымушаны пакінуць Чэхаславакію. Ён пераехаў у Аўстралію, дзе пэўны час яшчэ намагаўся адстойваць сваё добрае імя, а пасля адышоў ад навуковай працы.

Значную ўвагу ў сваёй манаграфіі Сымон Нарыжны прысвячае ўжо ўзгаданаму Чэшска-ўкраінскаму камітэту дапамогі ўкраінскім і беларускім студэнтам у Празе. Аўтар пазначае, што пад апекай камітэта ў 1923 г. было 23 студэнта-беларуса, а пазней гэта лічба вырасла да 150 чалавек [5, с. 73]. Арганізацыя працавала пад кіраўніцтвам Міністэрства замежных спраў ЧСР. Чэшска-ўкраінскі камітэт меў некалькі інтэрнатаў для студэнцкай моладзі з ліку эмігрантаў, забяспечваў студэнтаў вопраткай, падручнікамі, стыпендыямі, аднаразовымі выплатамі ў чэшскіх кронах. Арганізацыя дапамагала моладзі ў пошуках падпрацовак у час канікул, аднак адсочвала, каб гэта не перашкаджала вучобе. Найбольш здольныя студэнты пры дапамозе камітэта маглі паехаць у замежную экскурсію. Фактычна Чэшска-ўкраінскі камітэт дапамогі ўкраінскім і беларускім студэнтам аказваў падтрымку студэнтам-эмігрантам усіх вышэйшых навучальных устаноў Чэхаславакіі, за 10 год свайго існавання больш за 2000 студэнтаў атрымалі матэрыяльную дапамогу ад арганізацыі, што давала магчымасць ім набываць адукацыю за мяжой.

Такім чынам, супрацоўніцтва беларускай і ўкраінскай студэнцкай моладзі ў адукацыйных і навуковых праектах спрыяла развіццю ўзаемасувязей нацый. Падтрымка ўкраінскімі эмігрантамі на міжнародным узроўні беларускай супольнасці замежжа дапамагала ім разам адстойваць свае правы і інтарэсы. Асобным кірункам дзейнасці беларуска-ўкраінскіх камітэтаў і фондаў стала матэрыяльная і маральная дапамога студэнцкай моладзі ў асяродку дыяспар.

## *Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 571. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 2 зв.

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 571. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 4.

3. Головенько, В. Молодіжний рух української діаспори // Українська діаспора. – Київ: Інтел, 1994. – № 6. – С. 70-95.

4. Ільяшэвіч, М. Да ведама беларускага студэнства // Сялянская ніва. – 1927.– № 76. – С. 3.

5. Наріжний, С. Українська еміграція. Культурна праця української еміграції між двома світовими війнами: репринтне видання 1942 року. – Львів: НТШ, 2008. – 372 с.